***Таццяна ДАСАЕВА***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# Сучасны студэнт: станаўленне асобы (па матэрыялах газеты «Універсітэт»)

Гісторыя газеты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, заснаванай у 1929 г., цесна звязана з гісторыяй савецкай краіны, фарміраваннем у ёй новай сістэмы друку. Пасля рэвалюцыі 1917 г. і грамадзянскай вайны, калі стваралася сетка дзяржаўных перыядычных выданняў, вялікая ўвага надавалася дыферэнцыяцыі і тыпалагізацыі газет, выпрацоўцы іх уласнага «твару», які б адпавядаў прызначэнню выдання, інтарэсам яго аўдыторнай групы.

У 1920-я гады запоўніліся многія тыпалагічныя «нішы». Менавіта ў гэты перыяд з'яўляецца фабрычна-заводскі друк, газеты навучальных устаноў. Сетка такіх выданняў у канцы 1920-х гадоў была створана па ўсёй краіне. У прафесійнай сферы яны атрымалі назву «шматтыражныя газеты». Першыя выданні падобнага тыпу ствараліся на аснове насценных газет шляхам іх тыражыравання. Шматтыражкі – новая з'ява ў айчыннай журналістыцы –адпавядалі запатрабаванням часу. Як тып выдання яны садзейнічалі абуджэнню сацыяльнай актыўнасці людзей, дапамагалі ствараць спрыяльны псіхалагічны клімат у працоўных калектывах, у асяроддзі навучальнай моладзі.

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прайшла доўгі шлях. У адпаведнасці з часам змяняліся назвы выдання, яго змест, афармленне.

Кожны выпускнік БДУ запомніў універсітэцкую газету такой, якой яна была ў яго студэнцкія гады. Аўтар гэтых радкоў памятае «Беларускі ўніверсітэт» канца 1960-х – пачатку 1970-х гадоў. Вядома, у параўнанні з газетай на сучасным этапе, выданне таго часу было больш «строгім», стрыманым у змесце і сціплым у афармленні. Тым не менш, яно адлюстроўвала, як і зараз, навучальны працэс, студэнцкае жыццё ў разнастайных яго

праяўленнях, а самае галоўнае – станаўленне асобы студэнта як грамадзяніна, будучага спецыяліста, шматграннага чалавека.

З 2006 г. газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта выходзіць пад назвай «Універсітэт». Яе канцэпцыя распрацоўвалася з улікам інтарэсаў абітурыентаў (у тым ліку ліцэістаў БДУ), студэнтаў і выкладчыкаў. Матэрыялы размяшчаюцца ў разнастайных рубрыках, якія адлюстроўваць багатую тэматычную палітру выдання: «Студэнцкі інтарэс», «Навуковы інтарэс», «Студэнцкі мерыдыян», «Вольны час», «Творчая майстэрня», «Ведай нашых!», «Знаёмцеся», «Далучайцеся!», «Асобы», «Героі працы», «Актуальна», «Супрацоўніцтва», «Кантакты», «Міжнароднае супрацоўніцтва», «Навацыі», «Праекты», «Працоўнае лета», «Дасягненні», «Падзеі», «Урачыстасці», «Прэзентацыі», «Інфармацыйныя тэхналогіі», «Канферэнцыі», «Маніторынг», «Дыскусія», «Спартпляцоўка», «Фотафакт» і інш. «Універсітэт» мае спецвыпускі для абітурыентаў, тэматычныя старонкі для першакурснікаў, дадаткі («Псіхалагічная служба»).

Комплекс рубрык – своеасаблівая сістэма арыенціраў для чытачоў. Напрыклад, у матэрыяле спецвыпуску для абітурыентаў («Абітурыент-2013», ад 30 жніўня 2013 г.), акрамя карысных рэкамендацый і звестак пра структуру БДУ, парадак падачы дакументаў для паступлення і інш., акрэсліваюцца перспектывы навучання ў БДУ, дзе створаны ўмовы для гарманічнага ўсебаковага развіцця асабістых здольнасцяў і захапленняў, неабходнях для фарміравання паспяховай жыццёвай стратэгіі. Сцвярджаецца, што ў БДУ кожны студэнт можа стаць лідарам, рэалізаваць свае магчымасці на карысць універсітэта, грамадства, дзяржавы.

Рубрыкі спецвыпуску даюць уяўленне пра шляхі ажыццяўлення пазначаных перспектыў: «БДУ адчыняе акно ў свет» (пра супрацоўніцтва БДУ з замежнымі ВНУ, абмен студэнтамі, навучанне ў замежных ВНУ-партнёрах); «Міжнародныя праграмы акадэмічнай мабільнасці» (пра дзейнасць навуковых фондаў, стыпендыяльныя праграмы замежных

дзяржаў), «Студэнцкае жыццё – станаўленне асобы», «Спорт у БДУ», «Студэнцкі гарадок» і інш.

Тэматычная старонка для першакурснікаў «Школа першакурсніка» ад 30 жніўня 2013 г. – нібы компас, з дапамогай якога можна пазнаёміцца з універсітэтам і яго структурамі. Напрамкі пазначаны назвамі матэрыялаў «Шукаем таленты» (пра творчыя калектывы БДУ), «Першасная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ», «Стань лідарам» (пра студэнцкія арганізацыі альма-матар), «Паход у бібліятэку».

У дадатку «Псіхалагічная служба» (ад 30 жніўня 2013 г.) даюцца карысныя рэкамендацыі студэнтам («Вучоба і прафесійнае жыццё – на шляху да поспеху!»), прапагандуецца здаровы лад жыцця («Быць здаровым – модна!»), паведамляецца пра «Школу ўсвядомленага бацькоўства» («Курс на сямейнае шчасце») і студэнцкі псіхалагічны клуб («Псіхалогія – гэта цікава!»), якія могуць наведваць студэнты.

Газета «Ўніверсітэт» адлюстроўвае насычанае раснастайнымі падзеямі жыццё сучасных студэнтаў. Усё, што як перспектыва пазначана ў матэрыялах, адрасаваных абітурыентам, на канкрэтных прыкладах поспехаў і дасягненняў студэнтаў БДУ ілюструецца як рэалізацыя гэтай перспектывы праз удзел студэнтаў у шматлікіх канферэнцыях, алімпіядах, фестывалях, конкурсах творчых калектываў, моладзевых праектах, спартыўных спаборніцтвах і інш. Сама назва рубрыкі «Ведай нашых!», дзе звычайна змяшчаюцца матэрыялы пра пераможцаў гэтых мерапрыемстваў, утрымлівае гонар за БДУ і яго лепшых прадстаўнікоў.

У газеце паведамляецца таксама пра цікавыя ініцыятывы студэнцкіх аб'яднанняў, валанцёрства, працоўны семестр, студэнцкі побыт і адпачынак.

Значнае месца займаюць матэрыялы, скіраваныя на патрыятычнае выхаванне студэнтаў. У іх асвятляюцца старонкі гісторыі Беларусі, дасягненні культуры, апавядаецца пра славутых землякоў, ушаноўваецца памяць удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і многае іншае.

Не застаюцца па-за ўвагай гісторыя і традыцыі БДУ. Асаблівай цеплынёй напоўнены публікацыі пра выкладчыкаў (рубрыкі «Асобы», «Юбіляры», «Віншуем!», «Прэзентацыі»). Іх жыццёвы шлях, выдатныя чалавечыя і прафесійныя якасці, дасягненні, адданасць БДУ – прыклад для студэнтаў.

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая ліцера» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета», газета «Універсітэт» садзейнічае адукацыйнаму працэсу, патрыятычнаму выхаванню студэнтаў, выяўленню іх творчых здольнасцяў, грамадзянскаму і прафесійнаму росту, усебакова адлюстроўвае станаўленне асобы сучаснага студэнта.

***Ольга ДУБРОВСКАЯ***
*Белорусский государственный университет*

## Молодежный рынок СМИ: тенденции медиапотребления

Подростковые и молодежные средства массовой информации – это сформировавшийся элемент общей системы массовой коммуникации. Молодежная пресса «призвана приобщать подрастающее поколение к интеллектуальному и духовному потенциалу общества, являться важным каналом передачи информации от старшего поколения к младшему и одновременно средством коммуникации, позволяющим общаться друг с другом» [4].

Специфика молодежных СМИ определяется возрастом аудитории, особенностями социального положения и психологическими свойствами целевой группы. В связи с этим в молодежных средствах массовой информации используются специфические приемы отражения действительности, особый язык, оригинальные выразительные средства, способы контакта с аудиторией.

Одним из ведущих коммуникаторов в системе СМИ является периодическая печать. «Общественная потребность в печа-